# Свята ў Гродне



**Эліза Ажэшка згуртавала ў сябе сяброў, дзяцей і артыстаў, як сто год таму.**

Швейцарская даліна каля доміка Элізы Ажэшкі вярнулася на стагоддзе назад. Гаспадыня, як і раней, ладзіла свята, госці танчылі народныя танцы, спявалі і чыталі вершы знакамітай паэткі, а вакол бавілася процьма дзяцей. Дзень народзінаў Элізы Ажэшкі ў трэці раз адсвяткавалі ў Гродне 15 ліпеня.

Каля ганка музея, які пераўтварыўся ў сцэну, згуртавалася сотня чалавек. Гарадская інтэлігенцыя прыйшла паслухаць канцэрт. Вершы Ажэшкі па-беларуску, па-руску і па-польску дэкламавалі чытачы бібліятэкі, а таксама яе рэальныя ці магчымыя сябры: Францішак Багушэвіч, Цётка, Максім Багдановіч, які малым дзіцём мог прабягаць каля доміка пісьменніцы.

Сучасныя гродзенскія паэты прачыталі свае творы для гаспадыні доміка.

Найбольш руху назіралася на дзіцячай пляцоўцы. Малыя ўдзельнікі свята лавілі ў басейне цацачную рыбу, бавіліся ў рухавыя гульні ды з мяккімі цацкамі. Пані Эліза, як яе называлі, любіла дзяцей. У яе заўсёды гуртаваліся малыя, а на Раство яна дарыла ім пачастункі.

Наведвальнікам свята таксама прапанавалі паўдзельнічаць у віктарыне «Сцежкамі Элізы Ажэшкі» і паглядзець выставу фотаздымкаў старога Гродна Аляксандра Сявенкі і Віктара Саяпіна, выставу гербарыяў. Сябры беларускай этнічнай суполкі спявалі народныя творы ў аўтэнтычнай манеры і вучылі гарадзенцаў тагачасным танцам.

У наступным годзе ў 175-летні юбілей Элізы Ажэшкі арганізатары святкавання плануюць зрабіць акцэнт менавіта на чытанні вершаў вядомай паэткі.